w Krakowie drukowana. – Warszawa: Druk. J. K. Mci y Rzeczypospolitey u XX. Societatis Jesu, 1768.

2. Chorągiew powiatu grodzieńskiego // muzeumwp.pl/ [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.muzeumwp.pl/emwpaedia/choragiew-powiatu-grodzienskiego-z-lat-1613-1619.php /. – Date of access : 04.07.2012.

3. Chorągiew powiatu słonimskiego // http:// muzeumwp.pl/ [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.muzeumwp.pl/emwpaedia/choragiew-powiatu-slonimskiego-z-lat-1613-1619.php /. – Date of access: 04.07.2012.

4. Trakų vaivadijos pulko vėliava // lnm.lt [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.lnm.lt/virtualios-parodos/muziejaus-restauravimo-centre/511.html?task=view/. – Date of access: 18.01.2012.

5. *Kuczyński, S. K.* Polskie herby ziemskie: geneza, treści, funkcje / S. K. Kuczyński. – Warszawa: Wydawn. Naukowe PWN, 1993.

6. Chorągiew Mazowiecka // muzeum.czartoryskich.pl [Electronic resource]. – Mode of access: http://muzeum.czartoryskich.pl/pl/node/11307. – Date of access: 27.08.2016.

7. *Guzek, K. J.* Trzy flagi Powiatu Łęczyckiego – Trzecia flaga powiatu – część III / K. J. Guzek // pogotowieflagowe.pl [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.pogotowieflagowe.pl/artykuly/trzy-flagi-powiatu-leczyckiego-trzecia-flaga-powiatu-czesc-III.html. – Date of access: 29.08.2016.

8. *Ptak, J.* Weksylologia polska. Zarys problematyki / J. Ptak. – Warszawa: Wyd-wo DiG, 2016.

9. Chorągiew Prussów Królewskich // muzeumwp.pl / [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.muzeumwp.pl/kalendarium/01/. – Date of access: 04.07.2012.

10. Landesbanner von Appenzell // webcolbilder.nationalmuseum.ch [Electronic resource]. – Mode of access: https://webcolbilder.nationalmuseum.ch/529/DIG-1418.jpg/. – Date of access: 18.02.2021.

**(Дата падачы: 24.02.2021 г.)**

*С. А. Шыдлоўскі*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Наваполацк

*S. Shydlouski*
Polotsk State University, Novopolotsk

**УДК [94:663.5+394.24](476)“18/19”**

# АЛКАГОЛЬ У МІЖСАСЛОЎНЫХ КАМУНІКАЦЫЯХ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

# ALCOHOL IN CROSS-CLASS COMMUNICATIONS IN THE BELARUSIAN LANDS (LATE XIX – EARLY XX CENTURIES)

*У артыкуле разглядаецца роля алкаголю ў міжсаслоўных камунікацыях на беларускіх землях XIX – пачатку XX ст. Даследуецца значэнне прапінацыйнага права для развіцця паместнай гаспадаркі. Вызначаюцца адносіны дваранскай інтэлігенцыі да праблемы*

*алкагалізацыі беларускага сялянства. Паказваюцца механізмы функцыянавання гарэлкі як грашовага сурагату. Прыводзяцца прыклады выконвання алкаголем у міжсаслоўных камунікацыях рытуальна-сімвалічных функцый.*
*Ключавыя словы: алкаголь; міжсаслоўныя камунікацыі; прапінацыйнае права; алкагалізацыя насельніцтва; грашовы сурагат; карчма*

*The article considers the role of alcohol in cross-class communications in the Belarusian lands (late XIX – early XX centuries). The significance of propinative law for the development of local economy is investigated. The attitude of the noble intelligentsia to the problem of alcoholism of the Belarusian peasantry is determined. The mechanisms of functioning of vodka as a monetary surrogate are shown. Examples of alcohol performance in cross-class communications of ritual-symbolic functions are given.*
*Keywords: alcohol; cross-class communications; propination law; alcoholization of the population; monetary surrogate; tavern*

Вінакурэнне на працягу XIX – пачатку XX ст. заставалася адной з вядучых галін дваранскай прамысловасці Беларусі. На беларускіх землях пасля раздзелаў Рэчы Паспалітай захавалася прапінацыйнае[1] права [1, с. 571–572; 2, с. 365]. Апошняе забяспечвала мясцовым памешчыкам магчымасць вытворчасці і продажу алкагольных напояў. Пасля завяршэння вясеннее-восеньскіх работ выраб гарэлкі на вінакурнях рабіўся асноўным заняткам у фальварках. Сыравінай для вінакурэння служыла жытняя і ячменная мука, бульба, у нязначнай колькасці выкарыстоўваўся сухі і зялёны солад, аўсяная мука і кукуруза. Значная частка памешчыцкіх вінакурань і корчмаў здавалася гаспадарамі ў арэнду. Хатнія піваварні былі амаль у кожным маёнтку, але на працягу XIX ст. адбываўся заняпад піваварэння для ўласных патрэб. Піва рабілася прадуктам, якое прапаноўвалася спажыўцу прафесійнымі піваварнямі, самыя вялікія з якіх належалі замежнаму капіталу [3, с. 232].

Алкагольныя напоі рэалізоўваліся ў першую чаргу сялянам, якіх у асобных выпадках абавязвалі выкупаць пэўны аб’ём гарэлкі ў корчмах свайго пана, што дазваляе лічыць «прапінацыю» адной з неяўных форм феадальных пабораў [4, с. 227–228]. Так, паводле звестак П. Баброўскага, у 60-х гг. XIX ст. у беларускіх губернях за год на чалавека прыходзілася 1,5 вядра гарэлкі, кожная сялянская гаспадарка выдаткавала ў сярэднім за год 26 рублёў на алкаголь пры сярэднім чыншу з поўнага сялянскага надзелу ў казённым маёнтку 17 рублёў 65 капеек, а ў панскім – 33 рубля 47 капеек [5, с. 1−2]. Паводле падлікаў А. С. Дамбавецкага, у 1880−1881 гг. на заводах Магілёўскай губерні было выпрацавана 274 686 вёдзер спірту, што не перакрывала патрэб рэгіёну, – на адну сям’ю (у сярэднім 8 душ) у Магілёўскай губерні прыходзілася ў год 2 вядра спірту (39 рублёў 20 капеек) [3, с. 241−242]. Больш сціплымі былі аб’ёмы рэалізацыі піва, – паводле

[1]Прапінацыя – ад лац. *propinare* – піць за здароўе.

падлікаў А. С. Дамбавецкага, на адзінаццаць жыхароў Магілёўскай губерні прыходзілася адно вядро піва (у сярэднім каштавала 1 рубель 20 капеек) [3, с. 232−233].

Вінакурная вытворчасць на працягу разглядаемага перыяду развівалася як інавацыйная галіна айчыннай прамысловасці. З 40-х гг. XIX ст. паравы спосаб вінакурства і выкарыстанне ў тэхналагічным працэсе бульбы (тры пуда сямнаццаць фунтаў бульбы замянялі адзін пуд жыта) стваралі перадумовы для павелічэння колькасці буйных вінакурняў [6, с. 108]. На працягу сямідзесятых гадоў XIX ст. бульба складала каля чвэрці у вытворчасці гарэлкі, а ў васьмідзясятых – у звязку з павышэннем цэн на жыта доля бульбы павялічвалася да трэці і мела тэндэнцыю да далейшага павелічэння [3, с. 238].

4 ліпеня 1861 г. было прынятае «Палажэнне аб піцейным зборы», адпаведна якому з 1 студзеня 1863 г. уводзілася сістэма акцызнага збору на алкаголь, скасоўваўся водкуп піцейных збораў [7]. Рэформа прывяла да развіцця вінакурань прамысловага тыпу, ліквідавалася манапольнае права дваранства «курыць віно». У выніку прыняцця акцызных правіл 1863 г. адбывалася масавае спыненне дзейнасці дробных вінакурняў, якія карысталіся перагоннымі апаратамі Шварца, Галя, Адамса і мелі ў сярэднім 7–10 работнікаў [3, с. 236; 243–246]. У 1863−1864 гг. быў прыняты шэраг загадаў, паводле якіх дзейнасць прапінацыйнага права ў «заходніх губернях» была абмежавана тэрыторыяй прыватнаўласніцкіх гарадоў і мястэчак [8, с. 454].

З 1894 г. у Расійскай імперыі ўводзілася вінная манаполія. Дадзеная сістэма пачала дзейнічаць у беларускіх губернях з 1 ліпеня 1897 г. на падставе Найвысачэйша зацверджаных меркаванняў Дзяржаўнага савета «Аб уводзінах казённага продажу піцей у некаторых мясцовасцях імперыі» (2 мая 1895 г.) і «Аб прымяненні Палажэння аб казённым продажу піцей у паўднёвых і заходніх губернях, а таксама аб увядзенні азначанага продажу ў губернях С.-Пецярбургскай, Наўгародскай, Пскоўскай, Аланецкай і Харкаўскай» (19 лютага 1896 г.) [9; 10]. Паводле Найвысачэйша зацверджанага 29 красавіка 1896 г. меркавання Дзяржаўнага савета «Аб скасаванні права прапінацыі ў губернях Прывіслянскіх, Заходніх і Бесарабскай» агаворваўся механізм выкупу права прапінацыі ў прыватнаўласніцкіх гарадах і мястэчках за кошт казны [11]. Пасля дадзенай рэформы вінакурная вытворчасць працягвала заставацца адной з асноўных галін дваранскай прамысловасці [12, с. 11–12].

Акрамя відавочных эканамічных выгод ад вытворчасці і продажу алкагольных напояў, вінакурэнне прыносіла памешчыцкай гаспадарцы яшчэ адну значную карысць – пабочны прадукт вытворчасці спірту – барда, якую памешчыкі атрымлівалі з уласных вінакурняў, выкарыстоўвалася

з дадаткам сена і саломы на адкорм хатняй жывёлы і птушкі, што было пажыўна і танна, а галоўнае, давала значны аб'ём гною, які дапамагаў падтрымліваць урадлівасць памешчыцкіх палеткаў. Часам уладальнікі вінакурняў здавалі іх у арэнду толькі на правах атрымання барды [13, с. 98]. Гэты рэзон дазваляў многім публіцыстам пазітыўна ацэньваць шырокую распаўсюджанасць вінакурнай вытворчасці, хоць і прызнавалася, што следствам дадзенай гаспадарчай практыкі з'яўлялася алкагалізацыя і фізічная дэградацыя сялянства, здароўе якіх было аслаблена акрамя таго недаяданнем і антысанітарнымі ўмовамі жыцця [3, с. 243; 5, с. 13; 14, s. 204, 237].

Карчма з'яўлялася традыцыйным элементам беларускага сельскага краявіду. Так, у 1816 г. на 7998 вёсак і шляхецкіх ваколіц у Гродзенскай губерні прыходзілася 7080 корчмаў [15, s. 36]. У Барысаўскім павеце на 1847 г. на 979 вёсак і засценкаў – 672 карчмы [14, s. 2]. Паводле падлікаў П. Баброўскага, у 60-ых гадах XIX ст. у «заходнерускіх губернях» адзін шынок прыходзіўся на 250 − 300 душ [5, с. 1−2]. У 1868 годзе ў Сенненскім павеце было 249 піцейных устаноў і толькі 5 народных вучылішчаў [16, с. 109−110].

Карчма была не толькі адным з самых распаўсюджаных тыпаў гандлёвых устаноў краю: акрамя гарэлкі ў карчме можна было атрымаць піва, хлеб, малочныя прадукты [17, s. 85−90], але і важнай сацыяльнай прасторай, якая была добра акцэптавана народнай культурай. Так, на Палессі, паводле слоў Ю. Крашэўскага, існаваў звычай, згодна з якім сяляне пасля забору мёду з борцяў частавалі ім пана і суседзяў, а таксама неслі ў карчму, – лічылася, што пачастункі дапамогуць мець шмат мёду і на наступны год [18, s. 62]. С. В. Максімаў адзначаў, што для шляхты карчма замяняла «клуб, сойм і біржу» [19, с. 467], ці, паводле ўдакладнення Ю. Крашэўскага, – «ратушу і раду» [18, s. 42]. Корчмы часта ставіліся каля храмаў і ў людных гандлёвых месцах, бо арганізацыя рэлігійных фэстаў і кірмашоў стымулявала продаж алкаголю [16, с. 109−110; 20, s. 157]. Дадзенае назіранне пацвярджае і К. Тышкевіч, па словах якога, на свята Божага Цела здаралася ў храме было пуста – цэнтр свята пераносіўся ў мясцовую карчму [21, s. 41].

Прызнанне шкоды алкагалізацыі сялян у памешчыцкім асяроддзі не было безумоўным. Доўгі час у шляхецкай культурай традыцыі алкаголь разглядаўся як лекавы сродак. Напрыклад, лічылася, што ўрон здароўю наносіць не сам факт злоўжывання алкаголем, а спажыванне няякасных гатункаў. Так, Я. Тышкевіч называе прычынай «апаплексічнага ўдару», на яго думку, хваробы-маркера п'янства ў сялянскім асяродку, злоўжыванне «бульбяной гарэлкай» [14, s. 239]. Пэўная талерантнасць да алкаголю існавала і сярод сялян. Паводле П. Баброўскага, сялянскія дзеці пачыналі піць гарэлку з 12 гадоў [5, с. 1−2]. Па звестках Л. Галамбёўскага, немаўлят

у сялянскіх сем’ях кармілі кашыцай з хлеба, цукру, масла і піва, каб лепш спалі [22, s. 292]. Ужо троху падрослым дзецям давалі гарох, капусту, клёцкі і гарэлку [22, s. 292]. Варта адзначыць, што і дзеці дробнай шляхты таксама рана знаёміліся з алкаголем. Так, паводле сведчання С. Мараўскага, маленькім шляхціцам з сямі гадоў давалі моцныя спіртныя напоі ў якасці лекавага сродку («ад глістоў») [23, s. 43].

Адсутнасць сапраўднай гатоўнасці бачыць у п’янстве сацыяльнае зло было ўласціва нават людзям асвечаным. Паказальным у гэтай сувязі з’яўляецца вопыт, апісаны К. Тышкевічам. Пад час сваёй краязнаўчай экспедыцыі па Вяллі для лепшай камунікацыі з тубыльцамі даследчык народнай культуры ўзяў з сабой падарункі: хустачкі, рознакаляровыя стужкі, пацеркі, крыжыкі і медальёны з выявамі святых, што прынеслі, паводле слоў К. Тышкевіча, «шмат радасці сялянскім дзецям і шчасце іх маткам» [21, s. 35]. Па перакананню вандроўніка ён быў абавязаны гэтай прадбачлівасці мноствам сабраных «песенек» і легенд. Збору ж фальклорных матэрыялаў сярод мужчын найбольш паспрыяла частаванне гарэлкай [21, s. 45]. Паводле слоў вучонага, пакуль ён не пачынаў раздаваць ім грошы і наліваць гарэлку, сяляне саромеліся адказваць на яго пытанні аб мясцовых легендах [21, s. 78]. Аднак некаторыя сяляне, на здзіўленне фалькларыста, адмаўляліся і ад гарэлкі, і ад супрацоўніцтва [21, s. 95].

У сялянскай грамадзе алкагольны пачастунак заставаўся спосабам аддзякі за паслугу, якая аказвалася бясплатна на ўмовах суседскай узаемадапамогі. У падобным кантэксце гарэлка не з’яўлялася формай разліку. Дадзеная практыка захоўвалася і ў больш познія часы, калі ўжо назіралася значная трансфармацыя народнай культуры, прынамсі ў канцы XIX ст. Так, мемуарыст Б. Грабінскі згадвае, як даўжнікі, вяртаючы доўг, аддавалі не працэнты, а рабілі алкагольны пачастунак [24, с. 183].

У рытуалах патрыярхальнай камунікацыі сялянскай грамады і панскай сям’і алкаголь таксама атрымліваў сімвалічную каштоўнасць. Так, у велікодны панядзелак сяляне хадзілі віншаваць пана, рабілі «тысячныя паклоны» і дарылі кураня. У аддзяку на двор выкочвалася бочка гарэлкі. Пан піў першым за здароўе старэйшага селяніна. Потым пілі па чарзе сяляне, пачастунак працягваўся да канца дня [25, s. 293–294]. Шырока распаўсюджаным быў таксама звычай частавання панам сялян на дажынкі. Памешчык прапаноўваў сялянам гарэлку, піва, хлеб, сыр і агуркі. На панскім двары пачыналіся песні і скокі. Сяляне спявалі прыпеўкі, у якіх звычайна высмейваўся эканом і ўшаноўваўся пан [14, s. 197; 26, s. 31–32]. Паводле Л. Галамбёўскага, некаторыя памешчыкі стараліся замяняць гэтую старажытную традыцыю частаваннем у карчме [25, s. 266–269].

У А. К. Сержпутоўскага і Ч. Пяткевіча сустракаецца згадка аб фактах разліку гарэлкай, калі памешчыкі выкарыстоўвалі сялянскія талокі пры па-

трэбе тэрміновага выканання вялікіх аб'ёмаў работы [27, с. 210–214; 28, с. 82–85]. У маёнтках было і іншыя гаспадарчыя практыкі, якія прадугледжвалі алкаголь, як галоўную форму аплаты. Так, удзел сялян у панскіх ловах, якія працягваліся ў сярэднім да трох дзён, не залічаўся да адпрацоўкі паншчыны, – пры ўдалых ловах сяляне маглі атрымаць ад пана па чарцы гарэлкі [29, s. 82–83]. Сплавам лесу на беларускіх рэках займаліся дзясяткі тысяч работнікаў, якім мала плацілі, але багата частавалі гарэлкай [21, s. 30]. Сяляне, што займаліся сплавам, адбіваліся ад сельскай працы, ад сваіх сямей і ў выніку співаліся [18, s. 66]. Спробы Ч. Пяткевіча абараніць «польскага пана» ад крытыкі і сцвердзіць, што памешчыцкая завядзёнка адплачваць за работу алкагольным пачастункам ішла не на шкоду сялянству [28, с. 84–85], выглядаюць непераканаўча, у адрозненне ад сялянскіх талок – традыцыі ўзаемадапамогі, алкаголь выкарыстоўваўся памешчыкамі ў якасці грашовага сурагату. Дадзеная практыка была настолькі распаўсюджанай, што ў праектах інвентарных правіл, якія распрацоўваліся ў Міністэрстве ўнутраных спраў у 1844–1855 гг., уключалася палажэнне аб недапушчальнасці разлічвацца з сялянамі гарэлкай [4, с. 228].

Адной з распаўсюджаных стратэгій у памешчыцкім асяроддзі было перакладанне адказнасці за алкагалізацыю сялян на карчмароў-арандатараў. Так, Я. Тышкевіч прызнаваў, што п'янства было распаўсюджанай сярод сялян заганай, якая «асабліва пашыралася пасля вымалочвання зерня», – у карчме сяляне пакідалі амаль усё сабранае зерне, мёд, воск, сена, салому, лён, пяньку і нават мякіну, а таксама сельскагаспадарчыя прыстасаванні [14, s. 205, 223]. Паводле І. Лахніцкага, увесь прыбытак з сялянскай гаспадаркі звычайна пераходзіў да карчмара, і панам у большасці выпадкаў прыходзілася надзяляць сялян прадуктамі харчавання, каб тыя не памерлі з голаду [15, s. 53]. Такім чынам, панства, паводле выраза Я. Тышкевіча, «выплачвала карчмару падатак з п'янства сваіх сялян», – часам атрыманую ў дапамогу збожжа і бульбу селянін адносіў карчмару і праз тыдзень ізноў ішоў прасіць дапамогі ў пана [14, s. 205, 223]. Паводле звестак П. Баброўскага, карчмары часам абыходзілі з гарэлкай сялянскія двары, павялічваючы тым свае прыбыткі [5, с. 1–2]. Акрамя таго арандатары корчмаў, паводле інфармацыі Я. Тышкевіча, таемна ад паноў засявалі за даўгі сялянскія надзелы, выкарыстоўваючы сялянскую ж працу, і прадавалі потым гэты ўраджай [14, s. 205, 223]. Я. Тышкевіч і іншыя вышэй цытаваныя прадстаўнікі шляхецкай інтэлігенцыі не выступалі аднак супраць права на прапінацыю. Так, Я. Тышкевіч ставіў толькі пытанне, каб корчмы ўтрымліваліся не яўрэямі, а хрысціянамі [14, s. 224–225], а К. Тышкевіч, напрыклад, ускладаў спадзевы ў барацьбе з п'янствам на рух цвярозасці, ініцыіраваны духавенствам [21, s. 252].

Варта аддаць належнае мясцовай інтэлігенцыі, сустракаліся і публічныя выступы, у якіх абазначалася галоўная прычына пашырэння п'янства сярод

беларускіх сялян, – эканамічная зацікаўленасць памешчыкаў [17, s. 85−90; 16, с. 109−110]. Трэба адзначыць, што чыншавая і ваколічная шляхта амаль не адрознівалася ад сялянства сваім ладам жыцця, а таксама «схільнасцю да забабонаў і п'янства» [14, s. 3; 30, s. 4−5; 31, с. 180]. Высокія расійскія чыноўнікі, у сваю чаргу, сярод найбольш вострых праблем беларускага краю таксама называлі неабмежаванае права мясцовых памешчыкаў на вінакурэнне, але праблема не вырашалася [16, с. 94].

Такім чынам, стымуляванне росту спажывання алкаголю сярод сялян і дробнай шляхты ў многіх памешчыцкіх гаспадарках рабілася абавязковай умовай паспяховага функцыянавання эканамічнай мадэлі маёнтка. Дзякуючы гэтаму гарантаваўся збыт гарэлкі з памешчыцкіх вінакурняў, павялічвалася прывабнасць арэнды корчмаў; сяляне рабіліся яшчэ больш эканамічна залежнымі і лаяльнымі ўладзе пана. У многіх схемах разліку памешчыкамі за сялянскую працу алкаголь служыў сурагатам грошаў і часта выступаў як сродак матывацыі сялян да працы. У міжсаслоўных камунікацыях захоўвалася рытуальна-сімвалічныя функцыі алкаголю, напрыклад, у межах такіх свят, як дажынкі і Вялікдзень.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. О учинении в Белорусских губерниях переписи о поголовном сборе податей; о сидке вина и свободной продаже онаго; о корчмах; о переводе Таможни на новую границу и о сборе с товаров пошлин; о учреждении казенной соляной продажи и об отдаче на аренду деревень. Высочайше утвержденный доклад и пункты белорусского генерал-губернатора графа Чернышева. 13 сентября 1772 г. // Полное собрание законов Российской империи: Собрание первое: с 1649 по 12 декабря 1825 года: в 45 т. – Т. XIX: 1770−1774 гг. – № 13865. – СПб.: Тип. II отд-ния Собственной Его Император. Величества канцелярии, 1830. – С. 571−573.

2. Об установлении пошлины с вина в привилегированных губерниях. Манифест. 29 сентября 1810 г. // Полное собрание законов Российской империи: собрание первое: с 1649 по 12 декабря 1825 года: в 48 т. – Т. XXXI: 1810−1811 гг. – № 24361. – СПб.: Тип. II отделения Собственной Его Император. Величества канцелярии, 1830. – С. 364−366.

3. Опыт описания Могилёвской Губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях: в 3 кн. Кн. 2 / под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилёв: Тип. губерн. правления, 1884. – [6], 1000, [2] с.

4. *Рэут, У. Р.* Праблема злоўжывання алкаголем у памешчыцкай вёсцы Беларусі ў святле крыніц па інвентарнай рэформе 1844–1857 гадоў / У. Р. Рэут // Трэці міжнародны кангрэс даследчыкаў Беларусі (11–13 кастр. 2013 г., Коўна): працоўныя матэрыялы. Т. 3. – Kaunas: Vytautas Magnus University Press, 2014. – С. 226–230.

5. *Бобровский, П. О.* Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России / П. О. Бобровский // Вестник Западной России. – Вильно, 1865. – Г. IV. – Кн. IV, ч. 3. – С. 1–17.

6. *Болбас, М. Ф.* Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.) / М. Ф. Болбас. – Мінск: Навука і тэхніка, 1966. – 286 с.

7. Высочайше утвержденное Положение о питейном сборе. Именной указ, данный Сенату. 4 июля 1861 г. // Полное собрание законов Российской империи: собрание второе: с 12 декабря 1825 года по 28 февраля 1881 года: в 55 т. – Т. XXXVI. Отд. 2: 1861. – № 37197. – СПб.: Тип. II отд-ния Собственной Его Император. Величества канцелярии, 1863. – С. 39−70.

8. *Лазаревский, Н.* Пропинационное право / Н. Лазаревский // Энциклопедический словарь: в 86 т. Т. XXV (49): Праяга – Просрочка отпуска / изд. Ф. А. Брокгауз, И. А. Эфрон. – СПб.: Семенов. Типо-Литография (И. А. Эфрона), 1898. – С. 453−455.

9. О введении казенной продажи питей в некоторых местностях Империи. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета. 2 мая 1895 г. // Полное собрание законов Российской империи: собрание третье: с 1.03.1881 г. по 1913 г.: в 33 т. – Т. XV: 1895. – № 11620. – СПб.: Гос. тип., 1899. – С. 271.

10. О применении Положения о казенной продажи питей в южных и западных губерниях, а также о введении означенной продажи в губерниях С.-Петербургской, Новгородской, Псковской, Олонецкой и Харьковской. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета. 19 февраля 1896 г. // Полное собрание законов Российской империи: собрание третье: с 1.03.1881 г. по 1913 г. : В 33 т. – Т. XVI. Отд. 1: 1896. – № 12545. – СПб.: Гос. тип., 1899. – С. 121−124.

11. Об отмене права пропинации в губерниях Привисленских, Западных и Бессарабской. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета. 29 апреля 1896 г. // Полное собрание законов Российской империи: собрание третье: с 1.03.1881 г. по 1913 г.: в 33 т. – Т. XVI. Отд. 1: 1896. – № 12851. – СПб.: Гос. тип., 1899. – С. 332−335.

12. *Жытко, А. П.* Мадэрнізацыя памешчыцкай гаспадаркі Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.) / А. П. Жытко // Працы гістарычнага факультэта БДУ. – Вып. 4. – Мінск: БДУ, 2009. – С. 3–12.

13. *Шыдлоўскі, С. А.* Развіццё вінакурнай і піваварнай вытворчасці ў Магілёўскай губерні (паводле звестак К. Ц. Анікіевіча і А. С. Дамбавецкага) / С. А. Шыдлоўскі // Жизнь и творческое наследие А. С. Дембовецкого: к 180-летию со дня рождения: материалы Междунар. науч.-практ. конф., г. Могилев, 13 марта 2020 г. – Мінск: Беларус. навука, 2021. – С. 97−99.

14. *Tyszkiewicz, E.* Opisanie powiatu borysowskiego pod względem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemysłowo-handlowym i lekarskim, z dodaniem wiadomości: o obyczajach, spiewach, przysłowiach i ubiorach ludu, gusłach, zabobonach itd. / E. Tyszkiewicz. – Wilno: Druk. A. Marcinowskiego, 1847. – 489, IV s.

15. *Lachnicki, I. E.* Statystyka gubernii litewsko grodzieńskiej / I. E. Lachnicki. – Wilno: Nakład i druk J. Zawadzki, 1817. – X, [2], 88 s.

16. *Аникиевич, К. Т.* Сенненский уезд Могилёвской губернии: опыт описания в географическом, историческом, этнографическом, бытовом, промышленном и статистическом отношениях, с картой уезда, схемой двух озёр и рисунками в тексте / К. Т. Аникиевич. – Могилёв: Губерн. тип., 1907. – 149 с.

17. *Gloger, Z.* Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce: w 2 t. / Z. Gloger. – Warszawa: Druk Wl. Lazarskiego, 1907–1909. – T. 2. – 1909. – 192 s.

18. *Kraszewski, J. I.* Wspomnienia Polesia, Wołynia i Litwy / J. I. Kraszewski. – Paryż: Nakładem J. K. Wilczynskiego, 1860. – 144 s.

19. *Максимов, С. В.* Белорусская Смоленщина с соседями / С. В. Максимов // Живописная Россия: в 12 т. / под общ. ред. П. П. Семенова. – М.: Вольфа, 1882. – Т. 3: Литовское и Белорусское Полесье / А. К. Киркор, П. П. Семенов, С. В. Максимов; репринт. восп. – 2-е изд. – Минск : БелЭн, 1994. – С. 429–473.

20. *Massalski, E. T.* Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy: romans administracijny: W 5 częściach. Część 3 / E. T. Massalski. – Wilno: W Drukarni A. Marcinkowskiego, 1833. – 197 s.

21. *Tyszkiewicz, K.* Wilija i jej brzegi: pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym / K. Tyszkiewicz. – Drezno: drukiem i nakładem Józefa I. Kraszewskiego, 1871. – XVI, 362 s.

22. *Gołębiowski, Ł.* Domy i dwory / Ł. Gołębiowski. – Warszawa: Druk. N. Gkücksberga, 1830. – [4], 296 с.

23. *Morawski, S.* Szlachta bracia: wspomnienia, gawędy, dialogi (1802–1850) / S. Morawski. – Poznań: Wydawnictwo Polskie R. Wegnera, 1929. – 259 s.

24. *Грабінскі, Б.* Сакольшчына − Горадня − Вільня / Б. Грабінскі // ARCHE. – № 5. – 2000. – С. 179−208.

25. *Gołębiowski, Ł.* Gry i zabawy różnych stanów w kraju całym, lub niektórych tylko prowincyach / Ł. Gołębiowski. – Warszawa: Druk N. Glücksberga, 1831. – 332 s.

26. *Gloger, Z.* Encyklopedja staropolska: w 4 t. / Z. Gloger. – Warszawa: Druk P. Laskauera i W. Babickiego, 1900–1903. – T. 2. – 1901. – 332 s.

27. *Сержпутовский, А. К.* Очерки Белоруссии. Талака / А. К. Сержпутовский // Живая старина. – 1907. – Вып. 4. – С. 210−214.

28. *Пяткевіч, Ч.* Грамадская культура Рэчыцкага Палесся / Ч. Пяткевіч; пер. з пол. У. Васілевіча і Л. Салавей. – Мінск: Беларус. навука, 2015. – 319 с.

29. *Massalski, E. T.* Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy : romans administracijny: W 5 częściach. Część 2 / E. T. Massalski. – Wilno: W Drukarni A. Marcinkowskiego, 1831. – 268 s.

30. *Kontrym, K.* Podróż Kontryma, urzędnika banku polskiego odbyta w roku 1829 po Polesiu / K. Kontrym  Wydana przez Edwarda Raczyńskiego. – Poznań: U Walentego Stefańskiego, 1839. – 72 s.

31. *Шыдлоўскі, С. А.* Шляхецкі этас у творах А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш» і Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня» / С. А. Шыдлоўскі // Acta albaruthenica: Навуковы зборнік / пад рэд. М. Хаўстовіча [і інш.].  – Мінск: Права і эканоміка, 2005. – Вып. 5. – С. 177−181.

**(Дата падачы: 28.02.2021 г.)**